# РАЗАМ – ЗА МОЦНУЮ І КВІТНЕЮЧУЮ БЕЛАРУСЬ!

**Сёння распачынае сваю работу пяты Усебеларускі народны сход. Гэта сапраўднае народнае веча, у якім прымуць удзел 2,5 тысячы абраных дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны**

Сёння з дакладам на сходзе выступіць Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара, чакаецца, што кіраўнік дзяржавы ў сваёй прамове адзначыць вынікі і перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на сучасным этапе, абазначыць праблемныя пытанні і шляхі іх вырашэння. У выступленні размова таксама пойдзе аб знешняй палітыцы Беларусі, выбудоўванні ўзаемавыгадных партнёрскіх адносін з рознымі краінамі і інтэграцыйнымі аб'яднаннямі з акцэнтам на гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Цырымонія адкрыцця пятага Усебеларускага народнага сходу і выступленне Прэзідэнта будуць трансліравацца 22 чэрвеня ў прамым эфіры па беларускіх тэлеканалах і Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Пачатак мерапрыемства запланаваны на 12.00. Чакаецца, што Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у рабоце пятага Усебеларускага народнага сходу і 23 чэрвеня. Кіраўнік дзяржавы выступіць з заключным словам на закрыцці ўсенароднага форуму, што таксама будзе паказана ў прамым эфіры ў перыяд з 12.00 да 13.00. Тэлеверсіі даклада кіраўніка дзяржавы, а таксама іншых найбольш яркіх выступленняў і момантаў пятага Усебеларускага народнага сходу будуць паказаны ў вячэрнім эфіры па беларускім тэлебачанні 22 і 23 чэрвеня ў 21.00.


Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 117 (28227) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# У сталіцу, на Народны сход

**Учора ў Мінск для ўдзелу ў сходзе прыбылі дэлегацыі з усёй краіны. Адну з іх — ад Ельскага раёна — сустрэў наш фотакарэспандэнт. Сярод лепшых прадстаўнікоў Ельшчыны — людзі розных прафесій і спецыяльнасцяў. Мікалай Трафімаў — галоўны ляснічы Ельскага лясгаса, Галіна Лопарт — настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ельскай раённай гімназіі, Сяргей Петралай — токар Ельскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм, Настасся Матыгіна — галоўны бухгалтар КСУП «Скараднянскі», Юрый Бараноўскі — галоўны інжынер КСУП «Саўгас «Камуніст». У складзе дэлегатаў — старшыня Ельскага райвыканкама Леанід Пісанік і яго намеснік Галіна Ільюк, старшыня раённага Савета дэпутатаў Сяргей Матузка.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Дзяржаўная справа

## АДНОЎЛЕНА РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ДОШКА ГОНАРУ



Яе ўрачыстае адкрыццё адбылося на плошчы Дзяржаўнага сцяга напярэдадні Усебеларускага народнага сходу

Фота БЕЛТА.

**Указам Прэзідэнта ад 15 чэрвеня 2016 года №225 па выніках рэспубліканскага спаборніцтва вызначаны 70 пераможцаў — рэгіёнаў і прадпрыемстваў, чые назвы адзначаны на дошцы.**

Па словах **міністра эканомікі Уладзіміра ЗІНОЎСКАГА**, які разам з **Васілём МАЦЮШЭЎСКІМ, першым намеснікам прэм'ер-міністра**, адкрыў адноўленую дошку, ушанаванне пераможцаў звязана з падвядзеннем вынікаў чарговай пяцігодкі. І занясенне на дошку гонару — гэта знак увагі дзяржавы да тых калектываў, якія дасягнулі найлепшых паказчыкаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця і эканоміі паліўна-энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў. Акрамя таго міністр адзначыў, што ў бягучай пяцігодцы плануецца развіваць робататэхніку, нана- і біятэхналогіі, медыцынскую прамысловасць і шэраг іншых галін, якія дазволяць ствараць інавацыйную прадукцыю.

СТАР. 2

■ Без грыфу «сакрэтна»

## РАДКІ ПРАЎДЫ

### У Нацыянальным архіве Беларусі прэзентавалі адразу тры кнігі, прысвечаныя ахвярам Вялікай Айчыннай вайны

**Карта групоўкі нямецкіх войск, датаваная 1 мая 1941 года, схема акупаванага Мінска з указаннем вуліц на нямецкі манер, дакладныя запіскі на імя Сталіна аб канцэнтрацыі войск вермахта ля нашых межаў — усё сведчыла, што пачнецца вайна. Пра тое, што нападзенне гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз не было поўнай нечаканасцю, расказваюць і іншыя артэфакты Вялікай Айчыннай, прадстаўленыя на выстаўцы «Забыццю не падлягае», якая адкрылася ў Нацыянальным архіве Беларусі.**

Шырокай грамадскасці таксама прэзентавалі зборнікі дакументаў і матэрыялаў «Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы. Памяць у Беларусі», «Лагеры савецкіх ваеннапалонных. 1941 — 1944 гг.» і даведнік «Асуджэнне замежных ваеннапалонных і інтэрніраваных у Беларусі. 1944 — 1951 гг.».

— Не прыехаць на гэтае мерапрыемства азначала б здрадзіць памяці роду, — перакананы **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Кожны трэці беларус загінуў на той вайне. У многіх гэтая рана ў сем'ях дагэтуль крывавіць. У нас, у Беларусі, гэта святая памяць і дзяржаўная інфармацыйная палітыка — нішто не забыта, ніхто не забыты. Здавалася б, шмат клопату ў нас з вамі, шмат цікавых тэм, калі казаць пра кнігавыданне, але менавіта такія кнігі, якія сёння прэзентуюцца, павінны выдавацца пры дзяржаўнай падтрымцы. Гэта тыя радкі, якія з пакалення ў пакаленне павінны быць праўдай, якая не падлягае ні забыццю, ні інсінуацыям. Таму дзяржаўная палітыка — гэта яшчэ і гістарычная праўда: не аддаць на ганьбаванне нашы святыні і каштоўнасці.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Дырэктар Нацыянальнага архіва Беларусі Віктар КУРАШ распавядае пра адну з прэзентуемых кніг.**

СТАР. 5

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Бельгія забароніць вольны продаж хімікатаў

Улады Бельгіі вырашылі забараніць з 1 ліпеня вольны продаж некаторых прадуктаў бытавой хіміі, якія могуць выкарыстоўвацца для стварэння самаробнай выбухоўкі. У спіс з сямі рэчываў трапілі перакіс вадароду, азотная кіслата, нітраметан і яшчэ чатыры гербіцыды, выраблены на аснове розных злучэнняў натрыю і хлору.

Бельгійскія ўлады таксама вырашылі ўзяць пад асаблівы кантроль продаж ацэтону і азотных угнаенняў прыватным асобам. Спецслужбы заклікалі ўладальнікаў адпаведных крамаў паведамляць па спецыяльным тэлефоне і электронным адрасе аб падазроных закупках. Па звестках паліцыі, ацэтон і перакіс вадароду ўжываліся ў якасці кампанентаў самаробнай выбухоўкі, якая была выкарыстана пры тэрактах 22 сакавіка ў аэрапорце і метро Бруселя.



У канцы сакавіка ў прытулку тэрарыстаў на вуліцы Мары Руж у брусельскай камуне Скарбек праваахоўнікі выявілі 15 кілаграмаў выбухоўкі, 150 літраў ацэтону, 30 літраў перакісу вадароду, дэтанатары, чамадан, напоўнены цвікамі і шрубамі, з дапамогай якіх тэрарысты маглі вырабіць бомбу.

### МАК не пускае расійскіх лёгкаатлетаў на Алімпіяду

Міжнародны алімпійскі камітэт на саміце ў Лазане падтрымаў рашэнне Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый (IAAF) адхіліць зборную Расіі ад удзелу ў Алімпійскіх гульнях 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра.

Рашэнне МАК носіць рэкамендацыйны характар. Між тым Усерасійская федэрацыя лёгкай атлетыкі разглядае магчымасць падачы іску ў Спартыўны арбітражны суд (CAS) у Лазане, каб аспрэчыць рашэнне IAAF. Права падаць апеляцыю ёсць таксама ў кожнага спартсмена. Кіраўнік МАК Томас Бах таксама заявіў, што ўся расійская алімпійская зборная не будзе адхілена ад удзелу ў Гульнях. Акрамя таго, ён дапусціў з'яўленне расійскіх лёгкаатлетаў у Рыа, але толькі ад міжнародных спартыўных федэрацый.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Жанчынам шкодна шмат працаваць?



Паводле слоў супрацоўнікаў універсітэта Агаё, калі ў жанчыны шмат нагрузак, фізічных і разумовых, у яе паўлічваецца рызыка развіцця сур'ёзных захворванняў, піша «Расійская газета». Гэта даказала даследаванне каля 7500 чалавек, навукоўцы ацэньвалі іх стан здароўя і ўзровень нагрузкі на працы. Так была выяўлена сувязь паміж хваробамі і колькасцю адпрацаваных гадзін за апошнія 32 гады.

Як высветлілася, чым больш працяглы працоўны тыдзень у жанчын, тым вышэйшая рызыка развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, артрыту, дыябету і раку. Рызыка павышалася, нават калі працоўны тыдзень доўжыўся больш за 40 гадзін. У выпадку, калі яна працягвалася 60 гадзін, рызыка з'яўлення хвароб праз 30 гадоў падвышалася ў тры разы. Эксперты падкрэсліваюць: акрамя працы, нагрузку для жанчыны складаюць хатнія справы. Прычына ўсіх хвароб — стрэс, які ўзнікае з-за ператалення. Характэрна: для мужчын актыўная праца, наадварот, карысная. Хоць, вядома, тут дзейнічае прынцып разумнасці.

■ Будзе падзея!

## «РАЗЛІЧВАЕМ НА ДВАЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ УДЗЕЛЬНІКАЎ»

### Арганізатары паўмарафону чакаюць ад спаборніцтваў ажыятажу

**Леташнія забегі выклікалі сапраўдны рэзананс. Па падліках міліцыі, на дыстанцыі беглі 19 тысяч як зарэгістраваных удзельнікаў, так і тых энтузіястаў, якія проста далучыліся да бегуноў. Сёлетні старт чакаецца з нямenшай цікавасцю. Што казаць, калі свой удзел у ім ужо пацвердзілі некалькі беларускіх топ-чыноўнікаў!..**

Шчыра кажучы, вельмі цікава назіраць, як сямімільнымі крокамі ў нашай краіне развіваецца бегавая культура. Аматары штодня бегаюць на стадыёнах, у парках, па сцежках здароўя. І Мінскі паўмарафон для такіх актыўных грамадзян — сапраўднае спартыўнае свята.

— Пасля завяршэння леташняга паўмарафону людзі не хацелі разыходзіцца, — узгадвае **Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі**, падчас адмысловай прэс-канферэнцыі. — Яны без шашлыка кантактавалі паміж сабой, фатаграфаваліся з медалямі і знаходзілі гэтае баўленне часу цікавым. А што пасля рабілася ў сацыяльных сетках!

Калі верыць статыстыцы, у забегах ўдзельнічалі прадстаўнікі 172 населеных пунктаў Беларусі і 38 краін свету. Лічбы, безумоўна, уражваюць. А як будзе гэтым разам?

СТАР. 2



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАДАВАЙЦЕ ПЫТАННІ, ВЫКАЗВАЙЦЕ ПАЖАДАННІ

**Падчас правядзення пятага Усебеларускага народнага сходу будзе працаваць «гарачая» тэлефонная лінія. 22 чэрвеня 2016 года — з 11.00 да 18.00 гадзін і 23 чэрвеня 2016 года — з 10.00 да 13.00 гадзін.**

**Кожны ахвотны можа патэлефанаваць па шматканальных тэлефонах: 276-00-00, 282-00-00, задаць пытанні, выказаць пажаданні. Код Мінска — 8-017.**

■ Слова — дэлегатам

# ПРЫЦЯГАЛЬНЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ ГАРАДЖАН І ТУРЫСТАЎ

**Віцебск на V Усебеларускім народным сходзе прадставяць 109 чалавек. Сярод іх старшыня гарвыканкама Віктар НІКАЛАЙКІН. На пасадзе з вясны 2009-га. У памінулым годзе за плённую дзейнасць у развіцці горада, аднаўленне помнікаў архітэктуры, павелічэнне колькасці турыстаў і іншыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Пашаны.**



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

## ВІЦЕБСК РАСЦЕ

Па колькасці насельніцтва Віцебск у Беларусі на чацвёртым месцы (пасля Мінска, Гомеля, Магілёва). На сёння тут каля 377 тысяч жыхароў. Цікава, што ў яго «жаночы твар»: сярод усіх гараджан усяго каля 167 тысяч прадстаўнікоў «моцнай палавіны чалавецтва». У апошнія гады фіксуецца паляпшэнне дэмаграфічнага становішча.

— Вось ужо трэці год натуральны прырост насельніцтва прыкладна 400 чалавек. Шмат людзей прыязджае да нас: у 1-м квартале на пастаяннае месца жыхарства прыехалі 2091 чалавек, з'ехалі 1356, — расказвае мэр Віцебска.

Мясцовая ўлада зацікаўлена ў павелічэнні колькасці жыхароў. Большая частка фінансавых паступленняў у казну — падатак на зарплату. Бюджэт таксама папаўняецца ў асноўным за кошт падаткаў на прыбытак, на дабаўленую вартасць, па спрошчанай сістэме падаткаабкладання. Плюс даходы ад рэалізацыі дзяржаўнай маёмасці.

За пяцігодку ў Віцебску ўзвялі каля 130 шматпавярховых жылых дамоў. Для параўнання, усяго ў горадзе 2421 шматкватэрны гмах. А вуліц, праспектаў, завулкаў — 1380.

— Калі лічыць новае жыллё ў квадратных метрах, гэта прыблізна 800 тысяч. Напрыклад, летась здалі пад ключ 145 тысяч «квадратаў». Практычна новы мікрараён вырас у Віцебску. Акрамя таго, развіваецца індывідуальнае будаўніцтва, — працягвае Віктар Нікалайкін.

Прыблізна 335 сем'яў перасялілі з дамоў без выгод, якія прызналі непрыдатнымі для пражывання.

Нядаўна быў заселены другі ў Віцебску 120-кватэрны арэндны дом. Мэр прызнае, што людзі маюць вялікую патрэбу ў такім жыллі.

— На пражыванне ў новым арэндным доме было пададзена больш за 700 заяў. Плата па кішэні: каля 1 мільёна рублёў у месяц — за аднапакаёвую кватэру. Пад 1,5 мільёна — за «двушку», каля 2-х мільёнаў за 3-пакаёвую. На другасным рынку, наколькі ведаю, меней чым за 2 мільёны зняць кватэру немагчыма, — падлічыў мэр.

Улічваючы вялікі попыт, гарвыканкам пастараецца і надалей узводзіць «метры ў арэнду».

## СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА

На жаль, у Віцебску, як кажуць, далёка да сярэдняй зарплаты па Мінску: 6 мільёнаў 585 тысяч у месяц (інфармацыя за красавік. — **А.П.**). Хоць і тут ёсць прадпрыемствы, дзе ў сярэднім зарабляюць больш за 10 і нават пад 14 мільёнаў рублёў.

Віктар Нікалайкін адзначыў, што ў зарплатных лідарах, акрамя прадпрыемстваў, напрыклад, па аказанні паслуг сувязі, пастаўцы электраэнергіі і газу, ёсць і недзяржаўныя. У прыватнасці, на фірме па вырабе ветэрынарных прэпаратаў плацяць у месяц у сярэднім 13,8 мільёна рублёў. А на некаторых дзяржаўных плацяць меней за 3 мільёны. Мэр сказаў, што ўсё залежыць ад таго, як кіраўнік забяспечыць плённую дзейнасць.

— Напрыклад, у школах дырэктары атрымліваюць па-рознаму: дзе па 8 мільёнаў, а ў некаторых — значна больш. Гэта тыя, што вядуць урокі і наладзілі актыўнае пазабюджэтнае фінансаванне (платныя паслугі школы. — **А.П.**). Так і вытворцы: дзе своечасова правялі мадэрнізацыю, асвоілі выраб канкурэнтаздольнай прадукцыі, там на плаву, — разважае старшыня гарвыканкама.

У цэлым за пяцігодку аб'ёмы прамысловай вытворчасці выраслі ў 1,4 раза!

## РЫНАК ПРАЦЫ

У Віцебску на сёння складаная сітуацыя на рынку працы. У афіцыйным спісе тых, хто яе шукаюць, каля 2,6 тысячы чалавек. Узровень беспрацоўя — 2,5%. Раней на 4 тысячы вакансій прэтэндавала толькі каля 600 беспрацоўных. Пры гэтым толькі за першыя 3 месяцы ўладкаваныя каля 615 гараджан.

Сярод новых вытворчасцяў — прадпрыемства па вырабе гандлёвага абсталявання. Літаральна другое жыццё атрымлівае футравы камбінат, які ўвайшоў у знакаміты недзяржаўны абутковы холдынг «Марка». Яго ўзначальвае сенатар Мікалай Мартынаў. Між іншым, прыкладна кожны шосты гараджанін працуе на прадпрыемствах малога, сярэдняга бізнесу, або, як кажуць, на сябе.

Скаргі з боку прадпрымальнікаў пра тое, што, маўляў, дорага арандаваць памяшканні гарадской камунальнай уласнасці, мэр аргументуе лічбамі. Па яго падліках, нават 5 еўра за «квадрат» танней, чым у камерцыйных гандлёвых цэнтрах. Мясцовая ўлада, дарэчы, за кошт грошай, атрыманых за арэнду, рамантуе двары. Дык чаму павінны «выйграваць» толькі камерсанты?

## САДКІ І ШКОЛЫ

Мэр не ўтойвае праблем. У прыватнасці, у новых мікрараёнах не хапае дзіцячых садкоў, школ, медыцынскіх устаноў.

— Але, каб пабудаваць школу, спатрэбіцца 242 мільярды рублёў, садок — каля 62, паліклініку — пад 270 мільярдаў, а на больш буйны амбулаторны медцэнтр — каля 452 мільярдаў, — канстатуе мэр.

Пры гэтым, вядома, трэба рамантаваць дарогі, тратуары, скверы. Працягваецца рамонт унікальнага будынка, дзе працавалі Шагал, вядомыя авангардысты. Трэба дабудаваць новы заапарк — самы вялікі ў краіне. Чакаюць завяршэння іншыя аб'екты.

У планах узвядзенне аквапарку, палаца гарадскога ЗАГСа (цяперашні знаходзіцца на 1-м паверсе жылога дома), парку забаў для дзятвы.

Значна лепшыя справы з крамамі. Як падкрэсліў мэр, нават на ўскраінах няма праблем з гандлем. У параўнанні з 2010 годам прырост гандлёвых плошчаў адбыўся ў 2 разы! Па сутнасці, вырашана пытанне грамадскага транспарту. У прыватнасці, за апошнія некалькі гадоў купілі па 20 тралейбусаў і трамваяў.

Сустракаючыся з землякамі — дэлегатамі сходу, Віктар Нікалайкін падкрэсліў, што ўдзельнічаць у такім форуме гэта і гонар, і неабходнасць падвесці вынікі.

— Думаю, трэба кожнаму дэлегату і кіраўніку прааналізаваць для сабе, як прайшла пяцігодка. Што дасягнута, створана? І неабходна вучыцца на памылках, каб ісці да паступальнага развіцця, — сказаў мэр.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# КУЛЬТУРНЫ ФУНДАМЕНТ
## будзе ў найбліжэйшыя пяць гадоў толькі ўмацоўвацца



**«На чарговым Усебеларускім народным сходзе будуць вызначаны галоўныя шляхі, па якіх мы павінны рухацца ў наступнай пяцігодцы, якія дазволяць працягнуць дынамічнае развіццё галін культуры, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту. Гэта забяспечыць далейшае развіццё, умацаванне пазіцый і росквіт Беларусі. Пры гэтым у цэнтры ўвагі застанецца комплекснае развіццё краіны», — паведаміла Святлана САРОКА, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дырэктар дзяржаўнай установы «Палац культуры г. Маладзечна», кажучы пра маючы адбыцца агульнанацыянальны форум — пяты Усебеларускі народны сход.**

На яе думку, тое, што 2016-ты абвешчаны Годам культуры, з'яўляецца пераканаўчым сведчаннем адметнай ролі культуры ў сучасным грамадстве. Пры гэтым развіццё сферы культуры застаецца адным з прыярытэтаў сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы, а культурны ўзровень грамадзян у значнай ступені вызначае эканамічныя дасягненні краіны. «Гэта нацэльвае прадстаўнікоў галіны культуры на павышэнне якасці прадастаўляемых паслуг, узроўню праводзімых мерапрыемстваў, а таксама на беражлівыя адносіны да творчай асобы, ад дзейнасці якой залежыць стан культуры ў краіне», — лічыць Святлана Сарока.

Парламентарый упэўнена, што ў сферы культуры ёсць усе рэзервы, каб працягнуць паступальнае развіццё і ўнесці ўклад у павышэнне дабрабыту беларусаў. «Толькі комплексны падыход да вырашэння паўсядзённых задач, уменне аналізаваць і крытычна падыходзіць да сваёй і працы падначаленых, вывучэнне вопыту работы і перадавых тэхналогій работы з насельніцтвам дазволіць нам падняць дзейнасць галіны культуры на якасна новы ўзровень, — адзначыла дырэктар Палаца культуры. — Бягучая пяцігодка паспрыяе павышэнню маральнай і матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках працы, а таксама вырашэнню шэрагу набалелых праблем».

Акрамя таго, за апошнія гады створаны шэраг прэферэнцый для галіны культуры. Сёння дзяржава ажыццяўляе канкрэтныя меры, накіраваныя на падтрымку сферы культуры. У мінулым пяцігоддзі паспяхова рэалізавана дзяржаўная праграма «Культура Беларусі на 2011—2015 гады» і прынята адпаведная праграма на 2016—2020 гады. Па словах Святланы Сарокі, гэты год стане знакавым для ўсёй галіны культуры. Будзе прыняты Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, які стане першым у свеце дакументам такога кшталту і першым, напісаным па-беларуску. Ён сістэматызуе заканадаўства ў сферы культуры, спросціць яго прымяненне і палепшыць умовы для працы ўстаноў культуры і людзей, якія задзейнічаны ў гэтай галіне.

Выступаючы на сходзе дэлегатаў пятага Усебеларускага народнага сходу ад Мінскай вобласці, сенатар адзначыла дасягненні цэнтральнага рэгіёна краіны за мінулую пяцігодку, а таксама агучыла актуальныя прапановы для ўнясення ў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2020 гады, накіраваныя на развіццё сферы культуры.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# «МОЛАДЗЬ ХОЧА ПРАЦАВАЦЬ І ВЕДАЦЬ, ЯКІМ БУДЗЕ ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ»

**Чаго чакае ад Усебеларускага народнага сходу моладзь з рэгіёнаў? Якія праблемы яе турбуюць? Чым яна можа пахваліцца? Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказаў дэлегат сходу Вадзім ЗАРУБА, першы сакратар Столінскай раённай арганізацыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**

— Ад з'езда заўсёды чакаем шмат: на ім жа вызначаюцца асноўныя кірункі на бліжэйшую пяцігодку, — кажа Вадзім Заруба. — Цікавяць пытанні, якія турбуюць не толькі нашу столінскую моладзь, але і ўвогуле ўсіх маладых людзей краіны. У першую чаргу, гэта працаўладкаванне. Моладзі не ўсё роўна, якім будзе заўтрашні дзень, дзе працаваць, як жыць далей. Студэнта, школьніка цікавіць, якія новыя спецыяльнасці будуць адкрывацца, ці будзе гарантаванае працоўнае месца пасля заканчэння ўніверсітэта. Турбуе і пытанне льготнага крэдытавання. Яно, відаць, сёння адно з самых важных. Моладзь нават не так моцна цікавіцца рэзкім павелічэннем заработнай платы, як магчымасцю атрымаць ільготнае жыллё.

Што да моладзі Століна, то ў раёне налічваецца калі 14 тысяч маладых людзей. Добрыя паказчыкі ў раённага камітэта БРСМ па занятасці моладзі летам. Усе хочуць працаваць, і студэнты таксама. У мяне зараз ёсць спіс на больш чым 100 студэнтаў устаноў адукацыі, якія прыязджаюць на летнія канікулы дадому і хочуць працаўладкавацца.

Летась у нас у складзе студэнцкіх атрадаў было працаўладкавана 426 чалавек. Па выніках рэспубліканскага конкурсу «Трэці працоўны семестр — 2015», атрад, што працаваў на Гарынскім агракамбінаце, быў прызнаны лепшым сэрвісным атрадам у Беларусі. Камандзір атрада, Дзмітрый Шурхай, навучэнец Столінскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа, быў прызнаны лепшым камандзірам. Увогуле ж наш раённы камітэт заняў трэцяе месца па паказчыку занятасці моладзі ў краіне сярод раённых камітэтаў.

Што да цікавінак у жыцці моладзі Столінскага раёна, то там вельмі развіты рух байкераў.

— Ёсць мотаклуб «Айран Самурай» (у перакладзе — «Жалезны самурай»), яго кіраўнік — Дзіма Цыганкоў, — расказаў першы сакратар раённай арганізацыі БРСМ. — Гады тры таму гэты хлопец прыйшоў з ідэяй правесці байкзлёт. Тады яго наведалі прыкладна 35 чалавек, праз год — каля ста чалавек, сёлета было прыкладна 200 байкераў. Яны прыехалі з розных куткоў Беларусі — з Мінска, Віцебска, Магілёва. Хлопцы з клуба нам дапамагаюць ва ўсім, у тым ліку і ў дабрачыннасці. Яны штогод пры правядзенні сваіх мерапрыемстваў наведваюць і прытулкі, і школы, і дамы сямейнага тыпу. Увогуле, мы робім шмат усяго. Байкеры дапамагаюць нам і ў рабоце з цяжкімі падлеткамі — апошнія ахвотна ідуць на кантакт з матацыклістамі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

*г. Столін.*



# ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ — ЯКАСНЫЯ КАДРЫ

**Фарміраванне канкурэнтаздольнай вытворчасці, нарошчванне экспарту, укараненне высокапрадуктыўных айчынных сартоў раслін і парод жывёл — такія кірункі развіцця сельскай гаспадаркі вызначаны ў мінулай Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады. Пра тое, што было дасягнута ў гэтай сферы за пяць гадоў работы і што яшчэ належыць дапрацаваць, «Звяздзе» расказала Лідзія ГРЫНЕЎСКАЯ, намеснік дырэктара сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Палеская ніва» ў аграгарадку Рамель, член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, вылучаная ад Столінскага раёна, дэлегат пятага Усебеларускага народнага сходу.**

## ХТО ПРАЦУЕ, ТАМУ І ШАНЦУЕ

Сёння «Палеская ніва» — гэта СВК з развітымі племяннной жывёлагадоўляй і элітнай гаспадаркай па збожжавых культурах і бульбе. Яшчэ ў 1995 годзе «Палескую ніву» ўключылі ў праект па дзяржпадтрымцы племянной жывёлагадоўлі. Яе галоўная адметнасць цяпер у тым, што элітныя прадуктыўныя пароды не завозяцца з-за мяжы, а вырошчваюцца на месцы, у краіне.

У 1995-м вучобу па тым, як весці гаспадарку, праводзілі спецыялісты з Германіі. Супрацоўнікі кааператыва з таго часу веды ўдасканалілі і цяпер дзеляцца імі з усімі ахвотнымі. «Да нас часам на тыдзень ці больш прыязджаюць з іншых СВК, вучацца, засвойваюць тэхналогію. Мы не патрабуем з іх ні дакументаў, ні афіцыйных запытаў. Толькі б пераняслі наш станоўчы вопыт і пазбеглі памылак. Таксама часта праводзім кансультацыі, выязджаем на месцы», — дзеліцца намеснік дырэктара кааператыва.

У гэтай пяцігодцы — у 2012 годзе — да «Палескай нівы» далучылі нерэнтабельную гаспадарку «Агра-Колас». Сам СВК традыцыйна займае першыя месцы ў паказчыках па надоі малака ў Столінскім раёне. Тады, чатыры гады таму, нягледзячы на далучэнне, «Палеская ніва» не знізіла свае пазіцыі, а засталася на першым месцы. Нядаўна да гаспадаркі далучыліся і дзве найбліжэйшыя да аграгарадка Рамель вёскі. «На паказчыкі гэтыя змены паўплывалі нязначна, але такім чынам мы «падцягнулі» на больш высокі ўзровень вытворчасці вёскі, зарплата ў іх стала вышэйшай, як у свой час у «Агра-Коласе», — расказвае сенатар.

## ЯК ВЫРАСЦІЦЬ КАДРЫ?

Зараз у «Палескай ніве» цалкам укамплектаваны штат супрацоўнікаў. Ёсць тут і дактары, і фельдшары, і заатэхнікі, і селекцыянеры, чаго не скажаш пра больш дробныя гаспадаркі. Па словах дэлегата сходу, сёння для сельскай гаспадаркі кадравае пытанне найбольш вострае.

— У свой час была прынятая праграма адраджэння і развіцця сяла на 2005—2010 гады, дзякуючы якой сталі ўзводзіцца аграгарадкі, — успамінае Лідзія Грынеўская. — Гэту сферу і надалей варта развіваць. Дамы, што збудавалі калісьці, ужо занятыя. Таму трэба будаваць новыя ўжо для маладых сем'яў. Трэба і надалей працягваць будаваць дамкі.

На думку дэлегата сходу, у сельскай гаспадарцы важна не толькі развіваць матэрыяльнае забеспячэнне маладых спецыялістаў, але і актыўна ўдзельнічаць у іх станаўленні як прафесіяналаў. «Трэба ўдзяляць ім як мага больш увагі: дзесьці зрабіць заўвагу, паправіць, растлумачыць, як лепш зрабіць, дзесьці — даць параду, адказаць на пытанні, і галоўнае — паказаць перспектыву і ў тым, як будзе паляпшацца вытворчасць, і ў іх прафесійным росце. Бо калі не звяртаць увагі на маладых, то як вырасціць такія неабходныя нам сёння кадры?», — задаецца пытаннем парламентарый.

## ВУЧЫЦЬ ЛЮБОВІ ДА ЗЯМЛІ ЗМАЛКУ

На думку Лідзіі Грынеўскай, у сельскай гаспадарцы варта развіваць і агараэкатурызм. У Столінскім раёне для гэтага ёсць і экалагічныя, і чалавечыя рэсурсы. Напрыклад, дырэктар Цэнтра драўляных скульптур, уладальнік звання «Ганаровы паляшук», ураджэнец вёскі Цераблічы Столінскага раёна Іван Супрунчык сваёй творчасцю нязменна прываблівае турыстаў. Таксама «Палеская ніва» арганізавала і Фестываль каня ў родным аграгарадку Рамель. Сёлета ён адбудзецца ў маштабах раёна другі раз — 21 жніўня. Летась гэта падзея аказалася цікавай не толькі жыхарам Століншчыны, але і гасцям з усёй краіны.

— Цяпер сярод школьнікаў найбольшай папулярнасцю карыстаецца маршрут на нашу племянную каняферму, дзе мы катаем дзяцей, пасля яны таксама наведваюць і Івана Піліпавіча. Такім чынам мы спрабуем прывучыць з дзяцінства школьнікаў да роднай культуры, да зямлі, да гаспадаркі. Бывае, прыедзе група, праўдзе час, а адно дзіця з усіх сапраўды захопіцца. Глядзіш, праз тыдзень ужо з бацькамі ізноў прыехаў пакатацца на кані, пасля яшчэ раз... Такі пасля, калі звяжа лёс з сельскай гаспадаркай, да працы сваёй будзе нераўнадушны і рабіць яе стане годна ў любых умовах, — лічыць намеснік дырэктара «Палескай нівы».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Пра гэта сказана ў Праграме пяцігодкі

# Кампетэнцыі — усё!
## Прафесіяналізм педагога — галоўная перадумова якасці адукацыі

**«Імідж настаўніка залежыць ад таго, наколькі ён адпавядае патрэбам часу», — такую думку выказаў рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Аляксандр ЖУК, каментуючы праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, якая будзе абмяркоўвацца на пятым Усебеларускім народным сходзе.**

— Інфармацыйныя тэхналогіі наступаюць. Дзеці валодаюць многімі навыкамі нават лепш за сваіх педагогаў, таму наша задача — сфарміраваць у сваіх выпускнікоў IT-кампетэнцыі, навучыць іх працаваць у інфармацыйным грамадстве. Я маю на ўвазе не толькі карыстанне камп'ютарам для прэзентацый, але і арганізацыю сеткавага ўзаемадзеяння, працу на аддаленым доступе, рэалізацыю праектных тэхналогій, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Гэта новы пласт прафесійных кампетэнцый педагогаў, які патрабуе паскоранага засваення, інакш мы адстанем ад дзяцей. Цяпер наш універсітэт распрацоўвае прафесійны стандарт педагога, у якім мы прапісваем новыя кампетэнцыі, звязаныя з IT-тэхналогіямі і працай з сям'ёй у новых умовах. У апошнія гады назіраецца крызіс сям'і, у нас шмат няпоўных сем'яў. Усё гэта трэба ўлічваць у падрыхтоўцы педагогаў. І трэці новы напрамак — гэта інклюзіўная адукацыя: кожны педагог павінен быць гатовы да працы з дзецьмі з асаблівасцямі развіцця і іх бацькамі. На падставе прафстандарту будзе перагледжаны змест педагагічнай адукацыі ў разрэзе ўсіх спецыяльнасцяў і спецыялізацый.

«Праца на якасць адукацыі, — упэўнены Аляксандр Жук, — найважнейшы вектар на найбліжэйшы час, паколькі ўся сістэма адукацыі скіравана на стварэнне чалавечага капіталу. Гэта галоўны рэсурс нашай краіны. Адной з перадумоў якасці адукацыі з'яўляецца прафесіяналізм настаўніка».

Летась у краіне была зацверджана Канцэпцыя развіцця педагагічнай адукацыі і створаны вучэбна-навукова-інавацыйны кластар. Яго кіруючым ядром стаў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт.

— Мы ўпэўнены, што будучыня — за кластарным падыходам. Стварэнне такой мадэлі дазволіць нам аб'яднаць інтэлектуальныя і матэрыяльныя рэсурсы, педагагічную навуку і перадавую педагагічную практыку і сканцэнтраваць агульныя намаганні вакол ключавых праблем як у педагагічнай адукацыі, так і сістэмы ў цэлым. Рэгіянальныя кластары аб'ядноўваюць установы адукацыі самых розных узроўняў: школы і гімназіі, на базе якіх створаны педагагічныя класы, сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Плюс да іх далучацца навуковыя і навукова-метадычныя ўстановы, лабараторыі, цэнтры і інстытуты развіцця адукацыі, якія сумесна з універсітэтамі кластара будуць займацца навукова-даследчай дзейнасцю, а таксама грамадскія арганізацыі і аб'яднанні. Фактычна мы будуем вертыкаль у падрыхтоўцы сучасных педагогаў: ад школы да сістэмы дадатковай адукацыі дарослых, і стаўка робіцца на практычную накіраванасць такой падрыхтоўкі, — дадаў Аляксандр Жук.

Рэктар педагагічнага ўніверсітэта лічыць, што педагогіка — прафесія не для кожнага, а настаўнік пачынаецца не з педуніверсітэта — гадаваць будучых педагогаў трэба яшчэ ў школе. Менавіта на гэта і нацэлены профільныя педагагічныя класы, якія актыўна ствараюцца па ўсёй краіне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Якім быць Мінску ў найбліжэйшыя 5 гадоў

**Кожны з нас хоча ведаць, што будзе заўтра, як і ў якіх умовах ён будзе жыць. Мы папрасілі старшыню Мінгарвыканкама Андрэя ШОРЦА пракаментаваць асобныя палажэнні праекта праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, якія самым непасрэдным чынам могуць закрануць штодзённы побыт жыхароў сталіцы.**

## Будуць будавацца «разумныя дамы»

Праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады прадугледжвае, што сістэма «разумны дом» стане стандартам для новых дамоў і кватэр. У сувязі з гэтым, паводле слоў Андрэя Шорца, колькасць спажыўцоў такой паслугі ў Мінску плануецца павялічыць. Гэта значыць у найбліжэйшыя гады ў некаторых пабудаваных дамах будзе праводзіцца оптавалакно з рознымі датчыкамі.

«Разумны дом» уяўляе сабой сістэму хатніх прылад, здольных выконваць дзеянні і вырашаць пэўныя задачы без удзелу чалавека. Напрыклад, гэтыя прылады могуць аўтаматычна ўключаць і выключаць святло, карэкціраваць работу ацяпляльнай сістэмы або кандыцыянера, аўтаматычна апавяшчаць пра ўзгаранні або працёк вады. А «разумныя разеткі» дадуць магчымасць дыстанцыйнага кіравання (падачы або адключэння напружання) работай уключаных у сетку бытавых электрапрыбораў.

Сучасныя «разумныя дамы» бяруць на сябе і ахоўную функцыю. Яны здольныя абараняцца ад пранікнення ў іх чужых людзей — з дапамогай відэаназірання і сігналізацыі. Таксама яны могуць уключаць час ад часу святло, музыку ці, напрыклад, гукі сабачага брэху, імітуючы тым самым наяўнасць жыцця ў доме. Калі ж пранікненне адбудзецца, сігнал аб гэтым адразу ж будзе пасланы не толькі ў міліцыю ці прыватнае ахоўнае агенцтва, але і ўладальніку дома.

Гэтую паслугу прапануе Белтэлекам. Спецыялісты сцвярджаюць, што «разумны дом» — выгадная сістэма, якая дазваляе эканоміць на асвятленні да 40% і на ацяпленні — да 30% сродкаў. Зрэшты, па словах мінскага мэра, жыхары сталіцы самі змогуць прааналізаваць, ці дазваляе «разумны дом» аптымізаваць выдаткі.

Колькасць «разумных дамоў» будзе залежаць ад попыту. Пакуль ён невысокі. Тым не менш, як сцвярджае Андрэй Шорац, раней, напрыклад, былі вельмі дарагімі мабільныя тэлефоны і камп'ютары. Цяпер гэтыя прылады ёсць практычна ў кожнага жыхара нашай краіны. Тое ж самае, на яго думку, будзе і з сістэмай «разумны дом». Не за гарамі час, калі яна стане даступнай кожнаму.

## Перасадзіць мінчан з асабістага аўто ў аўтобус

Значная частка жыцця сталічнага жыхара звязана з перамяшчэннем — на аўтамабілі або на грамадскім транспарце. Прычым, на думку экспертаў, ад таго, наколькі яно хуткае і зручнае, амаль на траціну залежыць якасць жыцця гараджан.

У Мінску ў апошнія гады лавінападобна расце колькасць аўтамабіляў, што ў сваю чаргу правакуе ўзнікненне затораў на дарогах. Да таго ж, многія беларусы, купіўшы машыну, не лічаць неабходным траціцца на паркоўку. Платныя паркінгі стаяць амаль пустыя, затое зялёныя зоны ў дварах застаўленыя аўтамабілямі.

Што тычыцца затораў у класічным разуменні, то старшыня Мінгарвыканкама лічыць, што ў Мінску іх няма, хоць узровень аўтамабілізацыі ў нашай сталіцы вышэйшы, чым у Маскве ці, напрыклад, Пекіне. Так, на 2 млн насельніцтва Мінска прыпадае каля 800 тысяч аўтамабіляў, у той час як у Пекіне на 25 млн жыхароў — толькі 6 млн аўтамабіляў.

Тым не менш агульнаеўрапейская тэндэнцыя на сённяшні дзень — палітыка стымулявання гараджан карыстацца больш грамадскім транспартам, чым асабістым. І, як адзначыў Андрэй Шорац у ходзе нядаўняй «прамой лініі» з мінчанамі, Мінгарвыканкам таксама думае над гэтым пытаннем.

Тут, па словах мэра, ёсць розныя спосабы. Можна павялічыць хуткасць перамяшчэння грамадскага транспарту за кошт выдзялення асобных палос для аўтобусаў і тралейбусаў. (Дарэчы, у новым генплане Мінска закладзены такія асобныя палосы на асноўных магістралях. — **Заўв. аўт.**).

Можна пашырыць зону платных парковак і абмежаваць доступ чужых машын у двары жылых дамоў. З гэтай мэтай сталічныя ўлады плануюць дазволіць мінчанам усталёўваць шлагбаумы на ўездах у двары шматпавярховых жылых дамоў.

Усе варыянты вырашэння праблемы, па словах Андрэя Шорца, пралічваюцца. Але, як адзначыў мэр сталіцы, рашэнне многіх пытанняў залежыць не толькі ад эканомікі, але ў першую чаргу ад ментальнасці людзей.

«На жаль, менталітэт у нашых людзей такі, што большасці трэба абавязкова пад'язджаць на аўтамабілі прама да працы ці да пад'езда дома. Прывяду толькі адзін прыклад. Перахопліваючая стаянка на 150 машына-месцаў практычна ўвесь час пустуе, занята ад сілы 10 месцаў. Хоць пакінуць аўтамабіль тут з 8 раніцы да 8 вечара можна ўсяго за 5,5 тыс. рублёў, па цане талончыка»... — сказаў Андрэй Шорац.

Дарэчы, цяпер у Мінску працуюць 24 платныя паркоўкі на 1739 месцаў. Да канца года колькасць такіх машына-месцаў плануецца павялічыць да 2 тысяч.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# АДНОЎЛЕНА РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ДОШКА ГОНАРУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Стварэнне новых відаў прадукцыі, развіццё традыцыйнай прамысловасці дасць свае вынікі ў эканоміцы і магчымасць забяспечыць тэмп росту ВУП у 112—115% за бягучую пяцігодку», — падкрэсліў ён.

Першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі адзначыў, што сёння на першы план выходзяць пытанні эфектыўнасці працы. «Неабходна дакладна пралічваць цану прымаемых кіраўніцкіх рашэнняў, дзейнічаць строга ў межах рэсурсных магчымасцяў. Паспяховае вырашэнне гэтых задач вельмі важна для падтрымання фінансавай стабільнасці, далейшага эканамічнага росту і збалансаванага развіцця эканомікі», — перакананы Васіль Мацюшэўскі. На яго думку, дзякуючы ўпартай працы, ініцыятыве, творчаму падыходу працоўных калектываў Беларусь дасягнула станоўчых вынікаў у сацыяльна-эканамічным развіцці і ўмацавала свае пазіцыі ў сусветных рэйтынгах. Па індэксе чалавечага развіцця краіна ў 2015 годзе заняла 50-е месца (у 2009 годзе была на 68-м), у рэйтынгу «Doing Business» — 44-е месца сярод 189 дзяржаў, адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# «...ДВАЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ УДЗЕЛЬНІКАЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мінулы паўмарафон учыніў сапраўдны фурор сярод студэнтаў, школьнікаў, — кажа Міхаіл Жураўкоў, міністр адукацыі Беларусі. — Водгаласы чуваць і да сёння. Студэнты рыхтуюцца да ўдзелу і ў сёлетнім, запрашаюць сваіх сяброў з-за мяжы. Кінуты кліч і рэктарскаму корпусу. Трэба, каб яны прабеглі не для прыгажосці, а каб прадэманстравалі ўсім — рэктары ў нас вядуць нармальны, здаровы лад жыцця. Таму ў гэтым годзе мы чакаем убачыць сярод удзельнікаў цэлыя каманды студэнтаў, школьнікаў...

— Паўмарафон пройдзе чацвёртага верасня. Пачнецца ў 11:00 каля Палаца спорту. Упэўнены, мерапрыемства будзе запатрабаваным, — лічыць Вадзім Дзевятоўскі. — Удзельнікі-іншаземцы змогуць атрымаць бясплатную візу. Плануем, іх будзе больш, чым летась. З улікам ажыятажу, які чакаем, разлічваем на ўдзел 20 тысяч чалавек.

Арганізатары будуць запрашаць для ўдзелу і вядомых бегуноў. А тварам паўмарафону мусіць стаць Вольга Мазуронак, дзейная пераможца гэтых спаборніцтваў. Вольга цяпер рыхтуецца да Алімпіяды ў Рыа-дэ-Жанэйра. І, магчыма, забег у Мінску стане для яе першым пасля Гульняў. Акрамя таго, ужо рыхтуецца так званая «дрым-цім», якую складуць вядомыя ў краіне асобы.

Дарэчы, зарэгістравацца для ўдзелу можна на сайце www.minskhalfmarathon.by. Старт падачы заявак распачаты 20 чэрвеня. Для школьнікаў, пенсіянераў прабежка пяцікіламетровай дыстанцыі будзе бясплатнай. Астатнім за ўдзел у «пяцёрцы» трэба будзе заплаціць.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

# ПА ШЛЯХУ РАЗВІЦЦЯ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

За гэтыя гады ў парламент паступіла 13 920 пісьмовых зваротаў, 1411 грамадзян прыйшлі на прыём. Вялікая колькасць людзей звярталася на прыёмы ў выбарчых акругах да сваіх дэпутатаў. У асноўным гэта пытанні, якія тычацца сферы ЖКГ, забеспячэння законнасці і правапарадку, прапановы па ўнясенні змен і дапаўненняў у заканадаўства і іншыя.

> Заслугоўвае асаблівай увагі прапанова ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Мінскай вобласці. Яны ўздымаюць пытанне аб неабходнасці ў нашай краіне закона аб патрыятызме.

Працягваецца работа па ўдасканаленні судовай сістэмы, на што будзе нацэлена прыняцце праектаў законаў "Аб выканаўчай вытворчасці", "Аб судовых выканаўцах", "Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь па пытаннях судовага ладу і судаводства". Па ініцыятыве дэпутатаў рыхтуецца новы праект Закона «Аб кампенсацыі нанесенай шкоды пацярпелым ад злачынстваў».

***— Чым могуць ганарыцца заканадаўцы?***

— Стваранай у нашай краіне сістэмай прававых механізмаў, накіраваных на ахову правоў дзіцяці. Зроблена шмат што, аднак цяпер наспеў шэраг праблем, якія неабходна вырашыць на заканадаўчым узроўні. Менавіта на гэта накіраваны праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў». Законапраект паказвае, як важна своечасова падаць руку дапамогі такім дзецям, падтрымаць першыя няўпэўненыя крокі ў дарослае жыццё.

У рамках заканадаўчага забеспячэння сацыяльнай палітыкі прыняты законы аб сацыяльным страхаванні, занятасці насельніцтва, ахове здароўя. Сёння наспела неабходнасць удасканаліць сістэму дапамогі для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Гэта магчыма зрабіць праз падаўжэнне магчымасці бацькам, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, атрымліваць дапамогу па доглядзе яго і адначасова працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці. Гэта палепшыць матэрыяльнае забеспячэнне сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, знізіць рызыку перадачы іх у інтэрнатныя ўстановы. Па ініцыятыве мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў укараняюцца новыя тэхналогіі сацыяльнага абслугоўвання (прыёмныя, гасцявыя сем'і і інш.), якія неабходна замацаваць на заканадаўчым узроўні. Гэтыя паслугі запатрабаваны насельніцтвам і з'яўляюцца эканамічна менш затратнымі.

***— Якую ролю ў заканатворчым працэсе іграюць звычайныя грамадзяне?***

— Важна адзначыць, што шмат важных прапаноў, ініцыятыў па ўдасканаленні заканадаўства паступае ад нашых людзей. Усе прапановы абавязкова разглядаюцца падчас падрыхтоўкі законапраектаў.

На мой погляд, заслугоўвае асаблівай увагі прапанова ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Мінскай вобласці. Яны ўздымаюць пытанне аб неабходнасці ў нашай краіне закона аб патрыятызме. Яны кажуць, што іх пакаленне — патрыётаў, захавальнікаў памяці нашай гісторыі, традыцый — паволі адыходзіць, а маладым людзі не павінны страціць тую сувязь пакаленняў. Трэба зберагчы галоўныя каштоўнасці, закладзеныя нашымі продкамі. Падтрымліваючы ініцыятыву нашых паважаных ветэранаў, думаю, што сапраўды будзе своечасовым звярнуць увагу на тое, пра што кажа наш Прэзідэнт: мы назаўжды захаваем нашу незалежнасць, калі гэтая ідэя будзе жыць у сэрцах і душах нашых людзей.

Прыйшоў час прымаць неадкладныя дадатковыя меры па барацьбе з экстрэмізмам, тэрарызмам, аптымізоўваць палітыку ў дачыненні да мігрантаў і бежанцаў. Беларусь адчула сур'ёзнае павелічэнне колькасці мігрантаў з Украіны, але змагла даць ім прытулак, магчымасць вучыцца і працаваць. Гэта патрабуе выхаду на новы ўзровень заканадаўчага рэгулявання пытанняў рэалізацыі міграцыйнай палітыкі, атрымання беларускага грамадзянства. Прынятыя заканадаўчыя акты накіраваны на ўмацаванне іміджу Беларусі як дзяржавы, якая праводзіць паслядоўную палітыку ў гуманітарнай сферы. Адначасова гэта важны крок, які дазволіць прадухіляць злоўжыванні пры атрыманні замежнікамі статусу бежанца.

> За гэтыя гады ў парламент паступіла 13 920 пісьмовых зваротаў, 1411 грамадзян прыйшлі на прыём.

***— Што можна сказаць пра дасягненні нашай парламенцкай дыпламатыі?***

— Міралюбівы знешнепалітычны курс адкрывае новыя магчымасці для міжнароднай дзейнасці. Пашыраючы прававую базу міжпарламенцкага супрацоўніцтва, мы імкнёмся максімальна задзейнічаць парламенцкую дыпламатыю ў мэтах развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў, прасоўвання прадукцыі на замежныя рынкі, усталявання кааперацыйных сувязяў, развіцця прамога дыялогу паміж рэгіёнамі і прадстаўнікамі дзелавых колаў.

Асаблівае значэнне надаецца развіццю інтэграцыйных сувязяў з нашымі стратэгічнымі партнёрамі па Еўразійскім эканамічным саюзе. Нарошчваецца ўзаемадзеянне з Расіяй, Кітаем, Эквадорам, Пакістанам, іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. З улікам практыкі прымянення наспела неабходнасць унесці карэкціроўкі ў Закон «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь».

yushkevich@zviazda.by

# У лес, як у музей

## На Лёзненшчыне гаспадыня аграсядзібы стварыла экалагічную сцежку

**Віцебская вобласць — лідар у краіне па колькасці прыватных сядзіб, дзе прымаюць турыстаў. Але экалагічную сцежку стварылі толькі ля адной па ініцыятыве гаспадыні. Яна на ўскраіне вёскі Пушкі Лёзненскага раёна. Мае паэтычную назву «Дакраніся да прыгожага». Па сцежцы прайшліся і мы.**

### Хто такі Васька?

Святлана Пукава, старшыня Лёзненскага сельскага Савета, па дарозе да экалагічнага раю сказала, што, на жаль, ва ўсім раёне такіх энтузіястаў, як Ніна Ніканава, уладальніца сядзібы «У Нінэль», адзінкі.

У аграрным турызме многія хочуць зарабляць, але далей жадання часта справа не ідзе. Дзяржавай створаны ўсе ўмовы. Патрабуецца для гэтага зусім няшмат: трэба жыць у сельскай мясцовасці, мець дастатковa месца пад дахам, каб маглі пераначаваць прыезджыя... Ды, бадай, і ўсё. Нахонт падаткаў: адна базавая велічыня ў год — гэта, пагадзіцеся, мара любога дзелавога чалавека. Але, для таго, каб справа сапраўды пачала прыносіць прыбытак і маральнае задавальненне, трэба ўмець прыняць госця прафесійна, гэта значыць так, каб ён зноў захацеў прыехаць і каб з захапленнем расказаў пра свой адпачынак усім сваім сябрам. У Ніны Ніканавай атрымліваецца менавіта так.

Святлана Пукава распавяла, што да спадарыні Ніканавай прыязджаюць па вопыт. У сядзібе праходзяць фэсты, раённыя святы, у тым ліку і спартыўныя. Ды і калі трэба штосьці цікавае паказаць гасцям Лёзненшчыны, рэдка абыходзіцца без экскурсіі на сядзібу.

Спадарыня Ніканава ў дзень візіту журналіста запрасіла ў госці сваіх аднакурснікаў. Разам вучыліся на біялагічным факультэце Віцебскага педагагічнага інстытута імя П.М. Машэрава (цяпер — Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт. — **Аўт.**). Яшчэ яна — прафесійны кухар! Аўтару гэтых радкоў пашчасціла ацаніць смак яе пачастунку. Гасцінная Ніна расказала, што на гэтым месцы калісьці стаяла панская сядзіба.

— Здаўна тут жылі людзі. Побач — паляна. У гонар пана яе ў народзе называюць «Васькіна гара». Да нашых дзён засталіся дрэвы з дарэвалюцыйных часоў. Славіўся пан тым, што яго сяляне атрымлівалі багатыя ўраджаі. Акрамя таго, ён вельмі любіў кветкі, таму іх было шмат у маёнтку, — сказала яна.

На жаль, нічога з архітэктурных збудаванняў пана Васіля сёння не ўбачыш. Але, відаць, ён быў добрым чалавекам, калі дагэтуль яго згадваюць з павагай.

### Галоўны тут... Нічыпар

Ніна падкрэсліла, што сцежка працягласцю 1,5 кіламетра — вынік не толькі яе намаганняў. Спачатку яна як настаўніца стварала яе з вучнямі. Потым далучыліся бацькі дзятвы. Бралі ўдзел у суботніках. З дазволу райвыканкама і лясгаса выраўноўвалі сцежку. Ёсць у дарожкі і «апякун».

— Усе тутэйшыя ведаюць казку пра лесавіка дзядзьку Нічыпара. Калі я ў мясцовай школе працавала, ён быў галоўным на ўсіх святах. Віншаваў таленавітых вучняў з пачаткам новага навучальнага года, з удалымі выступленнямі на алімпіядах, а таксама выпускнікоў. Такім чынам, уже некалькі пакаленняў маіх зямлякоў з павагай да Нічыпара ставяцца. Таму менавіта ён — гаспадар лесу, сцежкі, — тлумачыць крэатыўная гаспадыня сядзібы.

Дарэчы, даволі рэдкая з'ява, каб у вёсцы і наваколлі быў свой «тутэйшы герой».

Перад тым, як прайсціся па сцежцы, людзі павінны пачаставаць «гаспадара лесу». Некаторыя і грошы пакідаюць. Ёсць і свае правілы паводзін на сцежцы. У прыватнасці, нельга ламаць ніякія сучкі, наогул нейк парушаць жыццё лесу. Забараняецца і збочваць. Хоць гаспадыня на сакрэце сказала, што лес прыветлівы, тамy заўсёды знойдзеш дарогу назад да цывілізацыі.

З надвор'ем нам пашанцавала. Было не горача і не холадна. Пасля «паклону» з частаваннем лесавіку, не спяшаючыся, пайшлі па сцежцы. Прафесійныя экалагі тлумачылі, што за расліна нам сустрэлася, што за дрэва... Пажартавалі, што галодным ў лесе яны ніколі не застануцца. Бо заўсёды ведаюць, што можна з'есці. Ды і не захварэюць, бо зёлак, карысных для здароўя, у беларускіх лясах шмат. Ніна Ніканава таксама збірае травы. Робіць з іх духмяную гарбату. Падказвае гасцям, якія зёлкі ад якой хваробы дапамагаюць вылечыцца.

На сцежцы 10 стаянак. Ёсць тут «Царства мурашкі», «Жыццё ракі»... На апошняй турыстам расказваюць пра тое, як ваявалі дзяды і прадзеды з фашыстамі. Нагадваюць пра подзвіг і пакуты нашых людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Уважлівыя могуць убачыць ля сцежкі тое, што засталося ад акопаў.

Асаблівая людзям падабаюцца два дубы, якія ствараюць «Вароты шчасця». Можна загадаць жаданне, і яно абавязкова збудзецца! А яшчэ ёсць дуб у два абхваты. Многіх уражвае елка з двума кронамі. Яна сімвалізуе зліццё двух сэрцаў. Побач вельмі любяць фатаграфавацца маладыя.

Што прыемна здзівіла: на сцежцы няма смецця. Па ёй ходзяць, як па музеі пад адкрытым небам.

### Майстар сваёй справы

У СМІ шмат пішуць пра тое, што, дзякуючы аграрнаму турызму беларусы ў глыбінцы могуць добра зарабляць. Адзін з экспертаў нядаўна адзначыў, што дадзенае нам прыродай — дыямент, які трэба прафесійна пераўтварыць у брыльянт.

Ніна Ніканава адзначае, што першапачаткова для яе грошы не былі галоўнай мэтай. Захацелася нешта рабіць для душы, бліжэй да прыроды быць. І ёй можна верыць, бо па той жа сцежцы можна прайсці бясплатна. А на народныя святы ўбачыць, як той казаў, «за дзякуй», і аніматараў.

У канцы месяца традыцыйна пройдуць Дні адчыненых дзвярэй сельскіх сядзіб. І «У Нінэль» стане зноў месцам сустрэч. Сюды прыедуць тыя, хто планує свой водпуск. А вопытныя і пачаткоўныя гаспадары «вясковых гатэляў» абмяркуюць прафесійныя нюансы.

Спадарыня Ніканава, дарэчы, атрымала дыплом на курсах, арганізаваных Беларускай гандлёва-прамысловай палатай. У адной з краін ЕС вучылася прымаць іншаземцаў на найлепшым узроўні.

